# Даследаванне праблем знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага XIII–XVIII ст. на кафедры міжнародных адносін БДУ

**ЛАШКЕВІЧ С. А.,**
*канд. гіст. навук, дац.,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

З моманту свайго заснавання кафедра міжнародных адносін актыўна ўключылася ў працэс даследавання праблем знешняй палітыкі і дыпламатыі Вялікага Княства Літоўскага, пачынаючы з утварэння гэтай дзяржавы ў 1230-х гг. і заканчваючы трэцім падзелам Рэчы Паспалітай 1795 г. На сённяшні момант выкладчыкамі, дактарантамі, аспірантамі кафедры надрукавана больш за сотню навуковых работ па пазначанай праблеме. Кожны год студэнты абараняюць курсавыя работы, звязаныя тым ці іншым чынам са знешнепалітычнай дзейнасцю Княства. Для спецыяльнасцей «Міжнародныя адносіны», «Міжнародны турызм», «Сусветная эканоміка» і «Лінгвакраіназнаўства» факультэта міжнародных адносін БДУ распрацаваны лекцыйныя курсы «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі», у рамках якіх значная ўвага надаецца даследаванню праблем знешняй палітыкі і дыпламатыі ВКЛ.

Вывучэнне пытанняў знешняй палітыкі і дыпламатыі ВКЛ на кафедры міжнародных адносін мае некалькі асаблівасцей. Па-першае, вельмі цяжка фізічна ахапіць амаль 600-гадовы перыяд знешнепалітычнай дзейнасці краіны, таму даследчыкі сканцэнтравалі сваю ўвагу пераважна на праблемах знешняй палітыкі перыяду XVI і XVII стст. Гэта можна растлумачыць тым, што да нашых дзён у архівасховішчах Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы і іншых дзяржаў захавалася шмат дакументальных крыніц пазначанага перыяду, якія адлюстроўваюць шматлікія праблемы знешняй палітыкі Княства. Па-другое, за чвэрць стагоддзя на кафедры міжнародных адносін сярод навукоўцаў сфарміравалася своеасаблівая спецыялізацыя па вывучэнні знешнепалітычных працэсаў і дзейнасці ВКЛ на міжнароднай арэне. Пад пільнай увагай даследчыкаў апынуліся такія важныя пытанні, як знешнепалітычны механізм ВКЛ, арганізацыя і функцыянаванне дыпламатычных службаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, дыпламатычны цырыманіял Княства, праблема падзелу знешнепалітычных паўнамоцтваў і абавязкаў паміж Княствам

і Каронай Польскай, а таксама пытанні адстойвання знешнепалітычных інтарэсаў Княства ў рамках адзінай Рэчы Паспалітай, адносіны ВКЛ з Расійскай дзяржавай і Шведскім каралеўствам.

Калі гаварыць пра даследчыкаў, якія непасрэдна займаюцца пералічанымі праблемамі, то спачатку трэба узгадаць доктара гістарычных навук, прафесара кафедры У. Е. Снапкоўскага, які першым на кафедры міжнародных адносін яшчэ ў сярэдзіне 1990-х гг. пачаў займацца знешнепалітычнымі пытаннямі Княства, адкрываючы для сябе і навуковай супольнасці новыя і маладаследаваныя старонкі знешнепалітычнай гісторыі дзяржавы. Гісторык з’яўляецца аўтарам першага сістэматызаванага курса «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі», дзе вывучэнню міжнароднай дзейнасці ВКЛ надаецца вялікая ўвага. Дадзеная дысцыпліна паспяхова чытаецца на розных спецыяльнасцях факультэта міжнародных адносін БДУ. Прадметам даследавання У. Е. Снапкоўскага з’яўляюцца пытанні арганізацыі і функцыянавання дыпламатычных служб ВКЛ і Рэчы Паспалітай, адносіны Княства з замежнымі дзяржавамі, знешнепалітычныя інтарэсы Княства пасля падпісання Люблінскай уніі і іншыя праблемы. У. Е. Снапкоўскі першым з беларускіх навукоўцаў звярнуў увагу на такую праблему як размеркаванне знешнепалітычных паўнамоцтваў і абавязкаў паміж Каронай і Княствам у складзе Рэчы Паспалітай. Дадзены навуковы тэзіс паслужыў штуршком для працягу даследавання знешнепалітычных інтарэсаў і арганізацыі дыпламатычнай службы ВКЛ у паслялюблінскі перыяд. Пад яго навуковым кіраўніцтвам на кафедры міжнародных адносін абаронены дзве кандыдацкія дысертацыі па праблемах знешняй палітыкі і дыпламатыі ВКЛ канца XVI–XVII стст.

Яшчэ адным навукоўцам кафедры, які займаўся праблемай знешнепалітычнага механізму і арганізацыі дыпламатычнай службы ВКЛ і Рэчы Паспалітай, стаў кандыдат гістарычных навук дацэнт А. В. Ціхаміраў. У сваіх работах ён адзначыў, што ў канцы XVI ст. ВКЛ неаднаразова адмаўлялася выконваць палажэнні Люблінскай уніі аб правядзенні сумеснай з Рэччу Паспалітай знешняй палітыкі. Прадметам даследавання гісторыка таксама сталі пытанні дыпламатычнага цырыманіялу на прыкладзе стасункаў Рэчы Паспалітай з Расійскай дзяржавай.

Аўтар дадзенага артыкула кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры С. А. Лашкевіч займаецца вывучэннем такіх праблем, як знешнепалітычныя інтарэсы Княства ў складзе Рэчы Паспалітай у апошняй

трэці XVI ст., спецыфіка арганізацыі дыпламатычнай службы ВКЛ, дыпламатычныя адносіны Княства і Расійскай дзяржавы, прадстаўніцтва знешнепалітычных інтарэсаў Шведскага каралеўства ў Расійскай дзяржаве прадстаўнікамі ВКЛ, дыпламатычная дзейнасць найбольш вядомых палітычных дзеячоў Княства. У 2014 г. ім абаронена дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук на тэму «Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ва ўзаемаадносінах Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы (1586–1598 гг.)» пад навуковым кіраўніцтвам прафесара У. Е. Снапкоўскага. Гісторык з'яўляецца прыхільнікам ідэі суб'ектнасці ВКЛ у міжнародных адносінах апошняй трэці XVI ст., калі літвінскія знешнепалітычныя інтарэсы ставіліся вышэй за інтарэсы Кароны Польскай. Даследчык з'яўляецца аўтарам дзвюх манаграфій: «Асаблівасці знешнепалітычнай актыўнасці Вялікага княства Літоўскага (1569–1600 гг.)» і «Вільня і Масква ў канцы XVI ст.: дыпламатыя кампрамісаў».

Дыпламатычную службу Вялікага Княства Літоўскага ў XVII ст. даследуе Вольга Ігараўна Лазоркіна, у мінулым — аспірант кафедры міжнародных адносін, а сёння — кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры дыпламатычнай і консульскай службы БДУ. У 2009 г. яна абараніла дысертацыю на тэму «Дипломатическая служба Великого княжества Литовского во внешнеполитическом механизме Речи Посполитой в 1600–1697 гг.» таксама пад навуковым кіраўніцтвам прафесара У. Е. Снапкоўскага. Прадметам навуковага інтарэса Вольгі Ігараўны з'яўляюцца такія пытанні, як знешнепалітычныя паўнамоцтвы дзяржаўных інстытутаў і вышэйшых службовых асоб ВКЛ і Польшчы ў XVII ст., кампетэнцыі дыпламатычнай службы ВКЛ, знешнепалітычныя функцыі канцылярыі ВКЛ, прадстаўніцтва ВКЛ у дыпламатычных адносінах Рэчы Паспалітай з замежнымі дзяржавамі.

На кафедры міжнародных адносін працуе кандыдат гістарычных навук, дацэнт Алена Васільеўна Дземідовіч, якая таксама займаецца знешнепалітычнымі інтарэсамі і дыпламатыяй ВКЛ у адносінах да суседніх дзяржаў у першай трэці XVII ст. У 2012 г. яна паспяхова абараніла дысертацыю на тэму «Вялікае княства Літоўскае ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст.». Даследчыца з'яўляецца аўтарам амаль трох дзясяткаў навуковых работ, дзе раскрываюцца праблемы правасуб'ектнасці ВКЛ, аналізуюцца ўзаемаадносіны Рэчы Паспалітай са Швецыяй і Расійскай

дзяржавай праз прызму інтарэсаў ВКЛ, даследуецца Ілжэдзмітрыяда і адносіны да яе шляхты Вялікага Княства Літоўскага. Знешнепалітычную дзейнасць Рэчы Паспалітай аўтар разглядае выключна праз унутрыпалітычныя працэсы, якія адбываліся ў дзяржаве.

Шэраг артыкулаў, прысвечаных знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ надрукаваў Андрэй Мікалаевіч Янушкевіч, кандыдат гістарычных навук, у мінулым дактарант кафедры міжнародных адносін БДУ (навуковы кансультант прафесар У. Е. Снапкоўскі). Тэмай яго спецыяльнага навуковага даследавання з'яўляецца дыпламатычная служба Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. Аўтар таксама аналізуе прававыя і інстытуцыянальныя асновы знешнепалітычнай дзейнасці Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV–XVI ст., разглядае ўдзел і ролю магнатаў Вялікага княства Літоўскага ў дыпламатычных зносінах з Маскоўскай дзяржавай у другой палове XVI ст. Іншыя артыкулы даследчыка прысвечаны першай Інфлянцкай вайне (1558–1570 гг.). Аўтар слушна адзначыў у сваіх работах, што ў ВКЛ у дачыненні да тэрыторыі Інфлянтаў існавалі таксама свае інтарэсы гандлёва-эканамічнага характару.

Падводзячы вынікі, можна канстатаваць, што на сённяшні дзень кафедра міжнародных адносін БДУ займае адну з лідзіруючых пазіцый у Рэспубліцы Беларусь у вывучэнні знешнепалітычнай дзейнасці і дыпламатыі ВКЛ, і асабліва гэта тычыцца падзей паслялюблінскага перыяду.